Снапкоўская С.В.
доктар педагагічных навук, доктар гістарычных навук, прафесар
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Беларусь

ПЕДАГАГІЧНАЕ ПАМЕЖЖА БЕЛАРУСІ ЯК ФАКТАР ФАРМІРАВАННЯ КУЛЬТУРНАГА ДЫЯЛОГА

У сучаснай беларускай гуманітарыстыцы існуюць ўстойлівыя традыцыі даследавання культурнага памежжа, ўзаемадзеяння і ўзаемаўплыву культур на этнічнасць беларускай тэрыторыі ў розныя гістарычныя перыяды.

Вывучэнне феномена культурнага, у тым ліку педагагічнага, памежжа з'яўляецца вельмі цікавым і перспектыўным напрамкам даследчай дзейнасці. Педагагічнае памежжа ўбірае ў сябе этнічныя, моўныя, культурныя, літаратурныя, канфесійныя і іншыя памежныя кантакты і ўплыў. Педагагічныя мяжы могуць быць бачнымі і незаўважанымі, прамалінейнымі і хвалепадобнымі, вузкімі і шырокімі, «пад замкам» і празрыстымі, зменлівымі і сталымі. Гісторыя асветы і педагогікі Беларусі дэманструе, што яе педагагічныя межы заўсёды былі адкрытымі, нябачнымі і празрыстымі.

Знаходжанне беларускіх земляў ў складзе шэрагу дзяржаўных фарміраванняў, асаблівасці дзяржаўна-тэрытарыяльнага і этнапалітычнага развіцця Беларусі. Яе геапалітычнае размяшчэнне ў цэнтры Усходняй Еўропы прадвызначылі моцны сацыяльна-палітычны, эканамічны, духоўна-культурны, моўны, канфесійны ўплыў на беларускі народ, яго светапогляд, культуру і менталітэт. Знешні фактар адыгрываў важную, а ў часы знаходжання Беларусі ў складзе Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі – вызначальную ролю ў развіцці беларускай культуры, асветы і педагагічнай думкі. Ні адзін з гэтых дзяржаўна-палітычных арганізмаў не меў выразнага беларускага характару. Беларускі этнас займаў звычайна ў складзе шматнацыянальных дзяржаў падпарадкаванае становішча, падвяргаўся моцнай асіміляцыі. Працэс фарміравання беларускай нацыі ня быў завершаны да пачатку XX ст. Падчас знаходжання Беларусі ў складзе прапольскай Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі ўклад беларускіх мысліцеляў і асветнікаў у развіццё духоўнай культуры свайго і суседніх народаў прыніжаўся ці ўвогуле не прызнаваўся. Грамадская думка і гістарыяграфія Польшчы і Расіі XVIII – пачатку XX ст. не прызнавалі факт існавання беларускай нацыі і, адпаведна, яе культуры, асветы, педагагічнай думкі [7, с. 39].

Перад беларускай культурай заўсёды вельмі востра стаялі праблемы ўзаемаадносін з іншанацыянальнымі, іншамоўнымі культурамі. Асаблівасці гістарычнага развіцця беларускага народа абумовілі адкрытасць яго культуры для замежных уплываў, глыбокую нацыянальную, этнакультурную талерантнасць. Культура Беларусі фарміравалася і развівалася на скрыжаванні двух тыпаў хрысціянскай цывілізацыі – заходняй, рымска-каталіцкай, а таксама ўсходняй, славяна-расійскай, візантыйска-праваслаўнай. Іх узаемаадносіны вагаліся ад узаемадзеяння і канструктыўных кантактаў да сутыкнення і ўзаемнага абнаўлення. На беларускім скрыжаванні сустракаліся, ўзаемадзейнічалі, узбагачаліся і пераасэнсоўваліся на мясцовай аснове многія, часта супрацлеглыя культурныя і духоўныя плыні. У выніку распаўсюджвання іншанацыянальных уплываў тут паўсталі цэлыя культурныя субстраты і анклавы.

Гэтыя культурна-духоўныя пласты немагчыма аддзяліць ад культуры Беларусі, якая мае такое ж права залічыць іх у сваю культурную спадчыну, як гэта рабілі і робяць у адносінах да многіх яе падзей і персаналій польская і руская культуры. Многія ўраджэнцы Беларусі сталі выбітнымі дзеячамі асветы, культуры, навукі, працуючы за межамі Радзімы, пакінулі прыкметны след у культуры іншых дзяржаў і народаў, зрабілі важкі ўнёсак у сусветную культурную скарбніцу [8, с.206]. У той жа час, гісторыя культуры, асветы і педагагічнай думкі Беларусі ведае шмат замежнікаў, якія плённа развівалі яе культуру і навуку, неслі асвету яе народу і з дапамогай гэтага заслужылі яго падзяку, набылі вядомасць. Перапляценне культур рэгіёну Цэнтральнай і Усходняй Еўропы прывяло да таго, што многіх адных і тых жа дзеячаў кожны народ гэтага рэгіёну лічыць сваімі.

У айчыннай педагагічнай навуцы роля і значэнне педагагічнага памежжа, педагагічных уплываў і Grenzgaenger Беларусі пакуль яшчэ не асэнсаваны ў належнай меры, нягледзячы на тое, што ўся гісторыя асветы і педагогікі краіны ўяўляе сабой дыялектычнае адзінства разнастайных унутраных і знешніх фактараў [2, с.81]

У гісторыка-педагагічных працах польскіх і расійскіх аўтараў, выдадзеных да пачатку XX ст., а то і пазней, ігнараваўся факт існавання беларускай культуры, асветы і педагагічнай думкі, абсалютызавалася роля вонкавага фактару – польскага альбо расійскага ўплыву – на развіццё нацыянальнай культуры і педагогікі. Пэўным чынам інэрцыя такога падыходу прасочвалася ў гісторыка-педагагічных працах навукоўцаў Польшчы, Расіі, СССР і іншых краін на працягу XX ст.[3, с.231]. Гэта ірнэрцыя не была пераадоленая беларускімі даследчыкамі, што адмоўна адбілася на стане педагагічнай навукі Беларусі савецкіх часоў.

Асноўную задачу свайго выступлення мы бачым у тым, каб паказаць ролю вонкавага фактару ў развіцці культуры,асветы і педагагічнай думкі Беларусі, адлюстраваць найбольш моцныя ўплыву і запазычанні замежных еўрапейскіх адукацыйных сістэм і педагагічных тэорый [1, с. 324] Яшчэ адной найважнейшай задачай сваёй працы мы лічым раскрыццё ўплыву і ўздзеяння вопыту беларускіх асветнікаў, педагогаў, мысліцеляў па арганізацыі асветы і педагагічнай думкі суседніх або больш аддаленых еўрапейскіх краін. Такім чынам, будзе прадстаўлена роля Беларусі як суб’екта і аб’екта педагагічных уплываў. Паколькі храналагічныя рамкі даследавання ахопліваюць вялікі гістарычны перыяд, то ўвага аўтара акцэнтуецца на найбольш важных і значных аспектах праблемы.

Для беларускіх зямель асветніцкія і педагагічныя пераходы праз межы пачаліся з самых старажытных часоў. І на працягу стагоддзяў паміж Беларуссю і суседнімі краінамі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы адбываліся інтэнсіўныя педагагічныя кантакты. Яны ажыццяўляліся не столькі праз асобных «педагагічных хадакоў», колькі праз вельмі значных, уплывовых і працяглых пераходаў праз межы цэлых культурна-асветніцкіх і адукацыйна-педагагічных сістэм і стратэгій. Можна сцвярджаць, што ў дачыненні да Беларусі гэта быў рух у адзін бок, менавіта ў яе бок. У выніку свайго геапалітычнага становішча Беларусь ператварылася ў аб’ект моцнай культурнай і духоўнай экспансіі з боку Польшчы і Расіі [9, с.3]. Гэта палажэнне беларуская гістарыяграфія характарызуе як знаходжанне паміж «молатам і кувалтай». Ўздзеянне гэтых дзяржаў і іх педагагічных стратэгій на беларускую сістэму адукацыі і выхавання было настолькі моцным, што пад пагрозай знішчэння апынуўся ўласны культурны імунітэт этнасу. Гэта адбывалася ў выніку працяглага знаходжання Беларусі ў складзе іншанацыянальных дзяржаў –

Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі, а таксама адсутнасці ўласнай дзяржаўнасці. Паланізацыя і русіфікацыя аказалі ў пэўныя гістарычныя перыяды негатыўнае ўздзеянне на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа і кансалідацыю беларускай нацыі. Разам з тым замежныя ўплыву адыгралі і станоўчую ролю ў развіцці культуры, адукацыі і педагагічнай думкі Беларусі. У XVI-XVIII стст. у краіне пад уздзеяннем Захаду склалася развітая сістэма адукацыі. У другой палове XIX ст. у выніку шырокага распаўсюджвання рускай школы пашырылася асвета сярод сялянскіх мас насельніцтва, стварылася вельмі арыгінальная беларуская культура, для якой былі характэрны шматканфесійнасць, шматмоўе, адкрытасць і талерантнасць.

Беларускі вопыт арганізацыі сістэмы адукацыі, педагагічныя ідэі беларускіх мысліцеляў і ўраджэнцаў Беларусі аказалі значны ўплыў на ўзбагачэнне педагагічнай практыкі і тэорыі суседніх краін. Галоўны ўрок культурных і педагагічных абменаў Беларусі са сваімі суседзямі заключаецца ў тым, што іх дыялог павінен ажыццяўляцца толькі пры наяўнасці моцнай ўласнай сістэмы культуры і адукацыі, якая магла б вытрымаць замежныя або іншанацыянальныя ўплывы і экспансіі.

Літаратура

1. Асвета і педагагічная думка у Беларусі: Са старажытных часоў да 1917 г. – Мінск: Нар. асвета, 1985. – 461 с.
2. Беларусіка – Albaruthenica. – Кн. 3: Нацыянальныя і рэлігійныя культуры, іх узаемадзеянне. – Мінск: Навука і тэхніка, 1994. – 431 с.
3. Грабскі, У.М. Польска-беларускія дачыненні у перыяд ад сфармавання нацыянальнай тоеснасці да падзелаў Рэчы Паспалітай // Беларусіка – Albaruthenica: Кн. 3. – С. 235.
4. Кузняева, С. Культурныя ўплывы і нацыянальная свядомасць (Беларусь у першай палове XIX ст. // Беларусіка – Albaruthenica.). – Кн. 3: Нацыянальныя і рэлігійныя культуры, іх узаемадзеянне. – Мінск: Навука і тэхніка, 1994. – С. 48-49.
5. Медынский, Е.Н. Братские школы Украины и Беларуси XVI-XVIII вв. и их роль в воссоединении Украины и России. – М., 1954. – 136 с.
6. Сапуноў, Б. Кнігі Ф. Скарыны у рускіх бібліятэках XVI-XVII стст. // Беларусіка – Albaruthenica: Кн. 1. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – С. 309—318.
7. Снапковская, С.В. Развитие образования и педагогической мысли Беларуси: вторая половина XIX – начало XX вв. / С. В. Снапковская. М.: ИТИПРАО, 2011. – 316 с.: ил.
8. Снапкоўская, С. В. Культуралагічная думка Беларусі: вучэб. дапам. / С.В.Снапкоўская, К.У.Антановіч. – Мінск: РІВШ, 2017. – 216 с.:іл.
9. Pidlipczak-Majerowicz, M. Bazylianie w Koronie i na Zitwie: Izkoly i ksiaki w dzialalnosci zakonu. – Warszawa, Wroclow, 1986, – S. 3, 265.